# Критика и библиография

# Крытыка і бібліяграфія

# Review and bibliography

*Курта Ф.* **Восточная Европа в Средние века (500–1300)** : в 2 т. Лейден ; Бостон : Брилл, 2019. 2 т. 1426 с. (на англ.).

*Курта Ф.* **Усходняя Еўропа ў Сярэднія вякі (500–1300)** : у 2 т. Лейдэн ; Бостан : Брыл, 2019. 2 т. 1426 с. (на англ.).

*Curta F.* **Eastern Europe in the Middle Ages (500–1300)** : in 2 vols. Leiden ; Boston : Brill, 2019. 2 vols. 1426 p.

Флорын Курта, прафесар Фларыдскага ўніверсітэта, стварыў працу, за якую многія іншыя гісторыкі ўзяліся б толькі ў калектыве суаўтараў. Перад намі двухтомнае даследаванне, якое ахоплівае перыяд Ранняга і Высокага сярэдневякоўя ў межах вялікага абшару – ад Ладажскага возера да Адрыятыкі і ад Одэра да ўсходніх рубяжоў Старажытнай Русі. Такім чынам, Усходняя Еўропа для Ф. Курты – гэта не больш чым канвенцыйны тэрмін. Як кажа сам аўтар ва ўводзінах, ідэя напісаць такую кнігу выклікана найперш адсутнасцю падобнай сінтэтычнай працы, якую можна было б рэкамендаваць студэнтам-гісторыкам у якасці асноўнай літаратуры. Безумоўна, гэта праца будзе цікавай кожнаму, хто захоча атрымаць агульнае ўяўленне пра адпаведную частку Еўропы ў Сярэдневякоўі. У 32 главах разглядаецца гісторыя асобных рэгіёнаў, краін і этнасаў – славян, авараў, хазараў, пястаўскай Польшчы, пшэмыслідскай Багеміі і г. д., асвятляюцца асноўныя аспекты жыцця грамадства: эканоміка, станаўленне феадалізму, сацыяльная арганізацыя, дэмаграфія, рэлігія, пісьменства, манументальнае мастацтва. Асобныя главы прысвечаны такім з’явам, як Крыжовыя паходы ў Балтыйскім рэгіёне і мангольскае нашэсце. Кніга ўключае бібліяграфічны спіс, а таксама прадметны, імянны і геаграфічны паказчыкі.

Напэўна, вузкія спецыялісты знойдуць, за што пакрытыкаваць аўтара, – кожны ў межах сваёй навуковай кампетэнцыі. Я ж хацеў бы звярнуць увагу на тое, чым гэта кніга, арыентаваная найперш на заходняга чытача, можа быць цікавай і для ўсходнееўрапейскай, у прыватнасці беларускай, аўдыторыі. Па-першае, сапраўды ўражвае ахоп літаратуры. Дастаткова сказаць, што 700 старонак уласна тэксту дапаўняюцца 630 старонкамі бібліяграфічнага спіса, у які ўключаны крыніцы на многіх мовах. Часта аўтар не паглыбляецца ў асобныя пытанні, затое наяўнасць багатых пастаронкавых спасылак і надзвычай шырокай бібліяграфіі дапаможа цікаўнаму чытачу звярнуцца да прац адпаведнай тэматыкі. Гэты велізарны спіс літаратуры сам па сабе каштоўны як своеасаблівы гістарыяграфічны даведнік. Варта адзначыць, што яго электронная версія даступная на сайце выдавецтва, што з’яўляецца немалаважнай акалічнасцю пры традыцыйна высокім кошце выдання.

Па-другое, Ф. Курта знаёміць чытача з дыскусійнымі праблемамі і навейшымі тэндэнцыямі ў падыходах да вывучэння пэўных пытанняў. Напрыклад, можна даведацца, што марксісцкая ідэя пра дружыну, якая з XI ст. паступова становіцца крыніцай фарміравання знаці, не знаходзіць археалагічнага пацвярджэння. Пахаванні са зброяй былі вельмі распаўсюджаны, аднак сярод іх складана вылучыць тыя, якія можна надзейна асацыіраваць з дружынай (p. 447–448). Аўтар адзначае, што канцэпцыя феадалізму як спосабу вытворчасці перастала цікавіць навукоўцаў у пачатку 1990-х гг. і што «маляваць карціну сярэдневяковага грамадства вялікімі мазкамі марксісцкай тэрміналогіі на сёння абсалютна выйшла з моды»[1] паўсюль, акрамя Расіі (можна было б смела дадаць: і Беларусі) (p. 466).

[1] Тут і далей пераклад наш. – *А. К.*

CC BY NC

Нарэшце, кніга каштоўная тым, што пераносіць добра (ці не вельмі) знаёмыя нам сюжэты і факты ў шырэйшы геаграфічны і культурны кантэкст. Гэта дазваляе ўбачыць звыклую карціну ў рэгіянальнай перспектыве. Напрыклад, можа падацца досыць цікавым, што «палітычная ўлада, якой валодалі некалькі жанчын у Полацкім княстве на працягу двух дзесяцігоддзяў XII ст., не мае паралелей у еўрапейскай гісторыі» (p. 458).

Кніга ўтрымлівае некалькі глаў, што непасрэдна закранаюць усходнееўрапейскі, або, як можна ўмоўна яго назваць, усходнеславянскі, рэгіён. Гэта пытанні, прысвечаныя фарміраванню славян, актыўнасці скандынаваў на паўднёва-ўсходнім кірунку, станаўленню Русі як палітычнай сілы і мангольскаму нашэсцю. Сюжэты, якія мы прывыклі звязваць з беларускай гісторыяй, напрыклад узвышэнне Полацка пры князях Брачыславе і Усяславе, застаюцца на ўзбочыне вялікага наратыву: аўтар не лічыць вартым згадкі імя полацкага князя, якому ў 980 г. нанёс паражэнне Уладзімір. Найперш даследчыка цікавяць пытанні большага маштабу, у прыватнасці генезіс палітычнай улады з цэнтрам у Кіеве. Гісторыя ўзнікнення Вялікага Княства Літоўскага хоць і ўпісваецца ў храналагічныя рамкі работы, аднак пакінута Ф. Куртам без належнай увагі. Толькі ў главе пра дзейнасць крыжакоў у Балтыцы ўтрымліваецца сціслы агляд падзей, звязаных з актыўнасцю літоўскіх князёў (p. 569–571). Кніга Ф. Курты – гэта прыклад таго, як выглядае гісторыя Беларусі ў агульнай рэгіянальнай карціне, калі яе назірае амерыканскі прафесар.

Асобнай увагі даследчыка заслугоўвае праблема паходжання і міграцыі славян з улікам яе дыскусійнасці. Ф. Курта вядомы як спецыяліст па гэтай праблематыцы, а Беларускае Палессе апошнім часам усё больш прэтэндуе на ролю прарадзімы славян. Аўтар з’яўляецца пратаганістам дунайскай версіі і выкарыстоўвае канструктывісцкі падыход да праблемы ўзнікнення славянскай ідэнтычнасці. Свае погляды Ф. Курта выклаў у манаграфіі «Паходжанне славян. Гісторыя і археалогія Ніжняга Дуная (500–700)» (*The making of the Slavs. History and archaeology of the Lower Danube region, 500–700*), выдадзенай яшчэ ў 2001 г. У рэцэнзуемай працы ён толькі сцісла пераказаў сваю аргументацыю, якую можна звесці да некалькіх асноўных тэзісаў. Так, аўтар сцвярджае, што няма ніякіх археалагічных сведчанняў міграцыі носьбітаў зарубінецкай, кіеўскай ці пражскай культур, з якімі асацыіруюцца раннія славяне, у кірунку дунайскай мяжы Візантыйскай імперыі. Матэрыяльная культура Маравіі, Багеміі, Польшчы, Беларусі і паўночнага захаду Расіі VI–VII стст. кардынальна адрозніваецца ад культуры тэрыторыі на поўнач ад Дуная, дзе, згодна з візантыйскімі крыніцамі, пражывалі склавіны. З’яўляецца ўсё больш археалагічных сведчанняў моцнага культурнага ўплыву з рэгіёна Ніжняга і Сярэдняга Дуная на Сярэдняе Падняпроўе ў VII ст. Пісьмовыя крыніцы не паведамляюць пра міграцыю славян раней за X ст.

Будучы далёкім ад гэтай праблематыкі, пакідаю пошук ісціны спецыялістам. Выхад новай кнігі Ф. Курты – гэта проста нагода звярнуць увагу на амаль поўную адсутнасць дыскусіі паміж амерыканскім даследчыкам і беларускімі навукоўцамі, якія проста не заўважаюць яго канцэпцыю. Паказальна, што ў дзвюх манаграфіях па славянагенезе, якія выйшлі ў Беларусі ў 2008 і 2012 гг., пра Ф. Курту няма ніводнай згадкі. Іранізуючы, можна сказаць, што той плаціць нашай гістарыяграфіі ўзаемнасцю: на 630 старонках бібліяграфічнага спіса знайшлося месца толькі для прац 15 беларускіх аўтараў. Гэты выпадак, на жаль, не ўнікальны. Ён ілюструе адарванасць беларускай гістарычнай навукі ад сусветнай нават у пытаннях, якія выходзяць далёка за межы нацыянальнага гістарычнага наратыву. Застаецца толькі выказаць спадзяванне на тое, што беларускія навукоўцы будуць актыўней дыскутаваць з заходнімі калегамі і ствараць больш прац, заўважных на сусветным узроўні. Ад гэтага абодва бакі толькі выйграюць.

***А. У. Казакоў***[2]

[2]*Александр Владимирович Казаков* – кандидат исторических наук; доцент кафедры истории Беларуси древнего времени и средних веков исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Аляксандр Уладзіміравіч Казакоў* – кандыдат гістарычных навук; дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Aliaksandr U. Kazakou*, PhD (history); associate professor at the department of Belarus history of ancient time and Middle Ages, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *kazakou@bsu.by*